Краязнаўства

Дзмітрый ХРОМЧАНКА

# Круглянскія маладагвардзейцы



*ХРОМЧАНКА Дзмітрый Мікалаевіч — в.а. загадчыка кафедры гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры БНТУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1947 г. у в. Цярэблічы Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1969 г. закончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М.Горкага, у 1983 г. — аспірантуру пры БДУ. У 1985 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Дзейнасць камсамола Беларусі па патрыятычнаму выхаванню моладзі ў гады трэцяй пяцігодкі (1938—чэрвень 1941 гг.)». Даследуе пытанні аграрнай гісторыі Беларусі XX ст., гісторыі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар-складальнік двух гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» па Крупскаму раёну (1999, 2008 гг.), адзін з аўтараў кнігі «Герб і флаг беларускай дзяржавы» (1997). Аўтар каля 40 навуковых артыкулаў.*

Чым далей адыходзяць ад нас гады Вялікай Айчыннай вайны, тым большую каштоўнасць набываюць новыя, невядомыя раней звесткі пра падзеі таго трагічнага і гераічнага часу. Асаблівую цікавасць уяўляюць новыя крыніцы на тэму падполля, дзе з-за канспірацыі не вялося ці амаль не вялося пісьмовых дакументаў альбо запісаў.

У кнізе «Памяць» Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці былі змешчаны ўспаміны аб камсамольска-маладзёжнай падпольнай арганізацыі «Обзор» (Организация борьбы за освобождение Родины), якая дзейнічала з восені 1941 да канца 1943 г. у райцэнтры Круглае і навакольных вёсках. Але, на жаль, тая публікацыя не давала поўнага ўяўлення пра дзейнасць круглянскіх падпольшчыкаў. Дадзены артыкул напісаны на падставе пісьмовых матэрыялаў і фотаздымкаў, што захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і выкарыстоўваюцца намі ўпершыню.

Што ж уяўляла сабой група «Обзор»?

Яшчэ ў кастрычніку 1941 г. каля дзесяці юнакоў і дзяўчат з райцэнтра сабраліся на сходку і вырашылі пачаць барацьбу з ворагам. Спачатку ставілася такая мэта: назапасіць зброі, а потым пайсці ў лес і арганізаваць партызанскі атрад. Перш за ўсё стварылі штаб, які ўзначаліў настаўнік, а затым дырэктар школы ў в. Паўлава Мікалай Сяргеевіч Радзько. У штаб таксама ўвайшлі Леанід Ракушаў, Мікалай Ракушаў, Клара Цітова і Пётр Аляксееў. На першым пасяджэнні зацвердзілі праграму і статут. Паступова колькасць членаў арганізацыі павялічвалася. Але здарылася трагічнае. Мікалай Радзько і настаўнік Паўлаўскай школы Рыгор Бабовіч паставілі ў мясцовым клубе спектакль, у якім, у прыватнасці, прагучалі крытычныя выказванні наконт Чырвонай Арміі і асабіста Сталіна. Пра гэта даведаліся партызаны і, не разабраўшыся, у чым справа, расстралялі і Радзько, і Бабовіча.

Пасля гібелі Радзько групу ўзначалілі Мікалай Маркавіч Ракушаў, які, аднак, хутка быў арыштаваны, і Леанід Нікіфаравіч Ракушаў. Прыблізна ў снежні 1941 г. Леанід здолеў звязацца з камандзірам партызанскага атрада «Сяргея» Сяргеем Рыгоравічам Жуніным (у будучым — камандзір 8-й Круглянскай брыгады, Герой Савецкага Саюза). У час сустрэчы Жунін заўважыў, што маладыя патрыёты зробяць больш карысці, калі замацуюцца на месцы, нават пойдуць на службу да акупантаў, каб перадаваць партызанам агентурныя звесткі, шкодзіць ворагу знутры. Асаблівую ўвагу Жунін засярodзіў на неабходнасці захоўваць строгую канспірацыю. На чарговай нарадзе юнакі і

Рэпазіторый БНТУ



С.З.Казлоў



Я.В.Бендзік



Ф.К.Комлеў

дзяўчаты канчаткова вырашылі сканцэнтравацца на падпольнай рабоце. Для гэтага арганізацыя была падзелена на пяцёркі. Іх кіраўнікамі сталі Сяргей Максімавіч Сухоцкі, Сяргей Захаравіч Казлоў, Іван Паўлавіч Рылькоў, Яфім Варфаламеевіч Бендзік, Фёдар Карнілавіч Комлеў. Для канспірацыі падпольшчыкі ўзялі сабе мянушкі. Напрыклад, М.Ракушаў стаў называцца «Уладзімірам Сокалавым», затым «Нікасам», Л.Ракушаў — «Гучковым», сёстры Клара і Жэня Цітовы — адпаведна «Валянціна Сокалава» і «Овад» і г. д. Так канчаткова сфарміравалася камсамольска-маладзёжная падпольная арганізацыя «Обзор» (гэтая назва была прынята па прапанове М.Ракушава ў пачатку 1942 г.)

Рознымі шляхамі прыйшлі ў яе маладыя патрыёты. М.Ракушаў, Л.Ракушаў і сёстры Цітовы да вайны пражывалі ў Круглым, Мікалай працаваў загадчыкам аддзела прапаганды райкама камсамола. Леанід у 1937 г. закончыў ваеннае вучылішча, удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне. У 1941 г. ваяваў пад Магілёвам, параненым трапіў у палон. У гэты час немцы, спадзеючыся на "бліцкрыг", частку ваеннапалонных, выхадцаў з Беларусі, адпусцілі да сем'яў. З дапамогаю бацькоў вярнуўся ў Круглае і Леанід.

Мікалай Радзько таксама нарадзіўся і вырас у Круглым, але ў канцы трыццатых гадоў быў накіраваны на працу настаўнікам у Заходнюю Беларусь. Калі пачалася акупацыя, ён вярнуўся дамоў і зноў пачаў настаўнічаць. Вырашыўшы дзейнічаць у горадзе, кіраўнікі падполля сталі актыўна ўкараняцца ў акупацыйныя органы ўлады. Мікалай Ракушаў уладкаваўся працаваць на раённым радыё, паказаў сябе перад акупантамі актыўным членам Саюза беларускай моладзі, нават ездзіў на вучобу прапагандыстаў у Барысаў. Леанід Ракушаў уладкаваўся спачатку сакратаром валаснай управы, затым пісарам у СД. Паколькі сёстры Клара і Жэня Цітовы вывучалі нямецкую мову ў школе і трохі яе ведалі, першая пайшла працаваць перакладчыкам у ваенную камендатуру, а другая — у сельгаскамендатуру.

Член групы Павел Аляксееў пайшоў працаваць у Круглянскую сельгасуправу.



М.М.Ракушаў



*Злева направа: Цітова Клара («Сокалава»), Баранава Кацярына («Карчагіна»), Ракушаў Леанід («Гучкоў»).*



Рэпазіторый БНТУ

Кацярына Дзмітрыеўна Баранава (Галынская) родам была з Казані. Пасля заканчэння Ленінградскага ўлікова-эканамічнага тэхнікума яе накіравалі на працу ў Круглянскае аддзяленне Дзяржбанка. Калі пачалася вайна, супрацоўнікі аддзялення спрабавалі эвакуіравацца. У Касцюковічах Кацярыну ўзялі на працу машыністкай у адну з воінскіх часцей 13-й арміі. Але воінская часць трапіла ў акружэнне, і такім чынам Баранава апынулася на Кругляншчыне. У пачатку 1942 г. яна стала членам арганізацыі «Обзор» і атрымала падпольную мянушку «Аляксандра Карчагіна». Затым, па заданню падпольшчыкаў, Кацярына працавала машыністкай у нямецкім гандлёвым таварыстве «Цэнтраль гандэль гезель-шафт ост». Працуючы тут, яна мела, хоць і невялікія, магчымасці атрымліваць неабходную інфармацыю. Акрамя таго, Баранава купляла ў нямецкай краме соль, харчы і з дапамогай таварышаў перапраўляла іх партызанам. Калі яе папярэдзілі, што немцы пачалі яе падазраваць, Кацярына ўцякла ў лес і ўступіла ў 28-ы партызанскі атрад 8-й Круглянскай брыгады.

Марыя Фадзееўна Рылькова да вайны жыла ў Оршы. Яе муж быў афіцэрам Чырвонай Арміі (у 1942 г. загінуў на фронце). З пачаткам вайны Марыя з малалетняй дачкой перабралася да бацькоў на Кругляншчыну, у вёску Пасырава. Яшчэ летам 1941 г. яна разам з бацькам і братам сабралі ў лесе 15 вінтовак і схавалі, потым зброя вельмі спатрэбілася. У гэтай жа вёсцы з ёй устанавіў сувязь разведчык партызанскай брыгады «Чэкіст» Рыгор Мікалаевіч Севасцьянаў (пазней ён стаў начальнікам штаба брыгады). Марыя пачала працаваць сувязной, а затым, калі ўвайшла ў «Обзор», стала галоўным сувязным звяном паміж падпольшчыкамі і партызанамі. Такім чынам, маладагвардзейцы сталі выконваць даручэнні не толькі Жуніна, але і камандавання брыгады «Чэкіст». У раённым цэнтры Рылькова трымала сувязь у асноўным з сёстрамі Цітовымі, а пасля іх арышту — з Ганнай Новікавай. Вясною 1944 г. Рылькову разам з маці арыштавалі і кінулі ў турму. Пасля вайны, у 1946 годзе, яна пісала сёстрам Цітовым: «Калі вас угналі з Круглага, мне стала значна цяжэй працаваць і хутка давялося пабыць у гестапа і перанесці катаванні. Дарагая Жэнечка! Я сядзела ў той жа камеры, дзе даводзілася сядзець і табе. Я чытала ўсё тое, што ты напісала на сцяне. Мне доўга сядзець не давялося, таму што хутка мяне вызваліла Чырвоная Армія. Праўда, здароўя давялося страціць шмат».



Дом М.М.Ракушава.

Марат Кузьміч Дашкевіч жыў у Круглым, быў актыўным камсамольцам. У першыя дні вайны разам з Пятром Ракушавым і іншымі камсамольцамі яны патруліравалі вуліцы райцэнтра, а калі пачалася акупацыя, сталі запісваць звесткі Саўінфармбюро, распаўсюджваць лістоўкі, нават падкінулі пісьмо самому начальніку паліцыі. Так М.Дашкевіч уступіў у «Обзор».

Разам з Васілём Стрыжэвічам і Яфімам Бендзікам яны ўтварылі на льнозаводзе падпольную групу, якую ўзначаліў Я.Бендзік.

Аляксандр Іванавіч Дарашкоў працаваў настаўнікам. У пачатку вайны ён быў прызваны ў Чырвоную Армію, але часць, у якой служыў, трапіла каля Магілёва ў акружэнне. Аляксандр апынуўся ў палоне, але ўцёк і вярнуўся ў в. Шупені Круглянскага раёна, дзе жыў да вайны. Хутка Дарашкоў сустрэўся з І.П.Рыльковым, з якім калісьці працавалі ў адной школе, і той звёў яго з падпольшчыкамі. З цягам часу Дарашкоў заняў пасаду загадчыка аддзела адукацыі раённай управы, а затым — следчага СД. Такім чынам ён атрымаў магчымасць своечасова папярэджваць сваіх таварышаў аб пагрозах арыштаў. Дарашкоў з дапамогай іншых членаў арганізацыі пачаў фабрыкаваць фіктыўныя дакументы і заводзіць следчыя справы на актыўных паліцаяў, якіх затым немцы арыштоўвалі як “памагатых партызан”.

Сяргей Сухоцкі перад самай вайной закончыў ваеннае вучылішча. Часць, дзе служыў лейтэнант Высоцкі, трымала абарону на рацэ Бярэзіна, але была разбіта. Сяргей спрабаваў самастойна перайсці праз лінію фронту. Пасля некалькіх няўдач ён быў вымушаны вярнуцца ў сваю родную вёску Кацярынава каля Круглага, дзе і звязаўся з падполлем.

Андрэй Анісімавіч Гурскі раней працаваў землеўпарадчыкам у Круглянскім раённым зямельным аддзеле і быў знарок пакінуты для падпольнай работы. Але ён нядоўга прабыў у Круглым і, калі ўзнікла небяспека арышту, уцёк з горада і стаў партызанам 30-га атрада 8-й Круглянскай брыгады.

Аляксандр Андрэевіч Інякін таксама ўваходзіў у “Обзор”. Вось яго ўспаміны: “Я быў членам гэтай арганізацыі з восені 1941 года па сакавік 1942 года. У вёсцы Улужжа, апрача мяне, у яе ўваходзілі Смірноў Аляксандр Іванавіч, Болдзісаў Міхаіл Антонавіч і Кацярына Міронаўна, прозвішча не памятаю. Болдзісаў М.А. звязаў мяне з кіраўнікамі Круглянскага падполля Ракушавым Мікалаем Маркавічам і Ракушавым Леанідам Нічыпаравічам. Кіраўнікі “Обзора” часцей за ўсё збіраліся ў доме М.Ракушава. У наступным сустрэчы неаднаразова адбываліся ў доме М.А.Болдзісава ва Улужжы... Аднойчы мы сталі вербаваць паліцэйскага з Цяцерынскай воласці, але ён у сакавіку 1942 года данёс пра нас у СД. Л.Н.Ракушаў неадкладна паведаміў аб гэтым, і нам з Смірновым да-

Репозиторий БНТУ



А.І.Дарашкоў



Я.А.Лініч



М.Ф.Марозава

вялося сысці ў партызанскі атрад № 28. Там я паведаміў начальніку асобага аддзела Аляксандраву Ігару Пятровічу пра існаванне ў Круглым падполля. Аляксандраў наладзіў сувязь з падпольшчыкамі". 28-ы атрад быў асаблівы, камсамольска-маладзёжны. Кіраваў ім Аляксандр Аляксеевіч Цярноўскі, а Аляксандр Інякін хутка стаў яго намеснікам. Такім чынам, круглянскія патрыёты трымалі сувязь не толькі з кіраўніцтвам 8-й Круглянскай партызанскай брыгады і брыгады "Чэкіст", але і з камандаваннем 28-га партызанскага атрада, які са жніўня 1943 г. дзейнічаў як асобны атрад Круглянскай ваенна-аператыўнай групы.

Да падпольнай работы былі далучаны члены сямей Мікалая Ракушава і сясцёр Цітовых. Марк Акімавіч Ракушаў — бацька Мікалая — працаваў у нарыхтоўчай канторы. Яму дапамагалі перадаваць партызанам данясенні і соль два падлеткі з в. Храпы Васіль і Пётр (прозвішчы невядомы). Яны пасля былі арыштаваны гестапа і затым у 1944 г. вызвалены Чырвонай Арміяй. Сам жа Марк Акімавіч не дажыў да вызвалення, ён быў расстраляны ў 1944 г. Брат Мікалая Ракушава Пётр служыў у паліцыі, быў арыштаваны і адпраўлены ў Бухенвальд.

Аляксандра Сяргееўна Цітова (падпольная мянушка «21») — маці Клары і Жэні — была расстраляна фашыстамі. Іх адзіннацацігадовы брат Аляксандр таксама дапамагаў падпольшчыкам. Разам са сваёй равесніцай Галінай Ракушавай яны сабралі ў разбуранай друкарні шрыфты, якія затым былі перададзены партызанам. Калі ж арыштавалі яго маці, хлопчыка таксама адправілі ў партызанскі атрад.

Падпольная група была створана ў раённай бальніцы. У яе ўвайшлі галоўны ўрач Е.С.Стромак, яго намеснік хірург Ф.К.Комлеў, фельчар Мірон Нырцоў, загадчыца аптэкі Яўгенія Андрэеўна Лініч, медсястра Эмілія Міронаўна Сінкевіч. Яны не толькі перадавалі партызанам медыкаменты, але пры неабходнасці аперыравалі параненых партызан у клінічных умовах. Напрыклад, менавіта ў бальніцы была зроблена складаная аперацыя камісару 30-га атрада 8-й Круглянскай брыгады Андрэю Антонавічу Гурскаму.

Паступова колькасць членаў арганізацыі "Обзор" павялічвалася і дасягнула 40 чалавек, усяго ж у яе ў розныя часы ўваходзіла больш за 60 чалавек. Усе яны заслугоўваюць таго, каб прыгадаць іх прозвішчы. У Круглым у падпольную арганізацыю, апрача названых вышэй, таксама ўваходзілі Барыс Антонавіч Болдзісаў і яго дочкі — Марыя і Вера, Вольга Іванаўна Дарашкова, Марат Дашкевіч, Барыс Кузьмін, Ніна Болдзісава, Алена Болдзісава, Я.Крывіцкі, Яфім Кузьміч Крывялёў, Ганна Сямёнаўна Крывялёва, Цімафей Кузьміч Крывялёў, Лізавета Крывялёва, Фелікс Нічыпаравіч Ракушаў, Ніна Дзмітрыеўна Рылькова, Ліна Піліпаўна Сінкевіч, Васіль Адамавіч Кунцэвіч, Марыя Фёдараўна Марозава, Цімафей Драздоў, Надзея Лазарчук. Гаспадаром явачнай кватэры ў Круглым быў Ігар Адамавіч Пажарніцкі, у яго ж захоўваўся і радыёпрыёмнік. Акрамя таго, у «Обзор» увайшла значная колькасць юнакоў і дзяўчат з навакольных вёсак. Яны альбо стваралі падпольныя групы, альбо працавалі сувязнымі, як, напрыклад, камсамольцы Анастасія Мацвееўна Зіньковіч і Аляксандр Мацвеевіч Зіньковіч з в. Радча. Аляксандр Данілавіч Зайкоўскі з в. Ваў-



А.М.Зіньковіч

Рэпазіторый БНТУ

каносава па заданню падполля працаваў у паліцыі. У в. Пасырава з падпольшчыкамі былі звязаны Марыя Фадзееўна Рылькова, Ніна Васільеўна Рылькова і Іван Паўлавіч Рылькоў, Уладзімір Васільевіч Палякоў; у в. Гай — С.Н.Трыпуцін, Алена Адамаўна Кунцэвіч; у в. Паліжаеўка —Яўсей Ігнатавіч Дзідзенка і яго дачка Еўдакія Яўсееўна Дзідзенка; у в. Новая Пожня — Клімент Ісакавіч Васілеўскі і Нічыпар Ключнікаў; у в. Круча — фельчар Галінскі, у в. Дарошкавічы — Ліна Міхееўна Чукасава. У в. Аладзінка стварылася падпольная група, у якую ўвайшлі Фёдар Макавенка, Леанід Катко, сям'я Васіля Макавенкі. У в. Слабодка падпольшчыкам дапамагалі Фёдар Кузьміч Галубцоў, Праскоў'я Фёдараўна Галубцова, Марыя Васільеўна Стрыжэвіч.

Пра работу падпольшчыкаў ёсць сведчанні камандзіраў партызанскіх атрадаў і брыгад, з якімі была звязана група. А.Інякін, намеснік камандзіра, затым камандзір 28-га атрада, адзначаў: “Яны нам давалі такія разведданыя, якімі не валодалі нават паліцыя, напрыклад, спісы агентаў гестапа, дакладны час прыбыцця карных атрадаў, плануемыя карныя акцыі супраць партызан, час і месца прызначаных расстрэлаў мірнага насельніцтва, западозранага ў сувязях з партызанамі, мерапрыемствы па забеспячэнню адпраўкі моладзі ў Германію і г. д.”.

Камандзір 8-й брыгады А.Маршчынін адзначаў: “З канца чэрвеня 1942 года, пасля ўстанаўлення сувязі з кіраўнікамі падпольнай арганізацыі, у асобы аддзел і штаб брыгады стала пастпупаць важная для нас інфармацыя аб зменах у складзе гарнізонаў у Круглым і іншых населеных пунктах, перамяшчэнні варожых падраздзяленняў па дарогах Круглае — Талачын і Круглае — Магілёў, аб намерах праціўніка і мяркуемых мерапрыемствах супраць партызан.

Акрамя разведданых, падпольшчыкі забяспечвалі атрады медыкаментамі, зброяй, боепрыпасамі, вялі работу па разлажэнню варожых гарнізонаў”.

Начальнік штаба брыгады “Чэкіст” Р.М.Севасцьянаў: “Падпольная арганізацыя дзейнічала актыўна і самаадддана. Многія баявыя дзеянні брыгады былі паспяхова выкананы ў выніку своечасовай і поўнай інфармацыі, што паступала ад «Обзора» праз сувязных Рылькову Марыю Фадзееўну (в. Пасырава), Уладзіміра Палякова (в. Гай), Новікаву Ганну Іванаўну і іншых”.

Акрамя збору разведінфармацыі, падпольшчыкі вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва, распаўсюджвалі лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, арганізоўвалі дыверсіі. Яны перадалі партызанам друкарскія шрыфты, пішучую машынку, паперу, значную колькасць чыстых бланкаў дакументаў з подпісамі і пячаткамі. З дапамогай падпольшчыкаў партызаны зрабілі засаду каля Круглянскай МТС і знішчылі вялікую групу фашыстаў. Пасля гэтага бою двое маладагвардзейцаў — Уладзімір Палякоў з в. Гай і Сяргей Трыпуцень вымушаны былі далучыцца да партызан. Хутка падпольшчыкі зрабілі яшчэ адзін напад на МТС. Частка тэхнікі была пашкоджана, але цыстэрны з гаручым узарваць не ўдалося. Члены арганізацыі “Обзор” спалілі нямецкі склад, льнозавод, узарвалі друкарню, часта парушалі тэлефонную сувязь. Летам 1942 г. падпольшчыкі разам з партызанамі спланавалі захоп Круглага. Па плану Леанід Ракушаў і Сяргей Сухоцкі арганізавалі ў райцэнтры дыверсію, каб адцягнуць увагу гарнізона і пасеяць паніку, адначасова партызаны пачалі абстрэл з гарматы. Але захапіць Круглае не ўдалося.

Падпольшчыкі праводзілі актыўную агітацыйную работу сярод паліцэйскіх і “народнікаў” — салдат палка так званай “Рускай нацыянальнай арміі”, які дыслацыраваўся на Магілёўшчыне. Яны арганізавалі пераход да партызан некалькіх груп “народнікаў” са зброяй і штабнымі дакументамі.

Летам 1943 г. Мікалай Ракушаў пазнаёміўся з палкоўнікам Паўлам Сцяпанавічам Сіманенкам, які працаваў у штабе 4-й нямецкай арміі (размяшчаўся ў г. Талачын) саветнікам па стратэгіі і тактыцы Чырвонай Арміі. Сіманенка двойчы сустракаўся з прадстаўнікамі партызан. Было вырашана правесці дыверсію ў Талачыне, але аперацыя не ўдалася. 25 жніўня Сіманенка разам з ардынарцам прыбыў у размяшчэнне партызан. Яму было даручана ўзначаліць партызанскі атрад, большасць байцоў якога складалі былыя паліцэйскія і “народнікі”. Атрад паспяхова змагаўся з ворагам да канца акупацыі. Пасля прыходу Чырвонай Арміі Сіманенку падверглі спецыяльнай праверцы, ён быў паніжаны ў званні і накіраваны на фронт. Вайну закончыў у званні падпалкоўніка, займаючы пасаду начальніка артылерыі дывізіі. У канцы вайны П.С.Сіманенка быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны першай ступені і Чырвонай Зоркі.

Арганізуючы “Обзор” і затым працуючы сярод ворагаў, юнакі і дзяўчаты, безумоўна, добра разумелі, што яны ставяць пад небяспеку сваё жыццё і жыццё сваіх блізкіх. Чаму яны выбралі цяжкі шлях барацьбы? Адказ дае пісьмо Жэні Цітовай камандзіру партызанскага атрада С.Жуніну, якое захавалася ў архіве сярод данясенняў падпольшчыкаў. Гэта не лістоўка, яно не прызначалася шырокаму колу чытачоў, мела асабісты характар, таму няма падстаў сумнявацца ў шчырасці дзяўчыны. Вось што пісала Жэня: “Калі б вы ведалі, дзядзя Сяргей, як цяжка тут працаваць, як цяжка выконваць ролю, якую ты ненавідзіш, якімі сіламі даводзіцца ўтрымліваць маску на твары і ўвесь час іграць — іграць і іграць ужо два гады без перадышкі. Кожны дзень становіцца ўсё больш невыносным. Як надакучыла сядзець у гэтай турме, як надакучыла смяяцца тады, калі хочацца плакаць. Хочацца ўсім гэтым гадам плюнуць у морды, раструшчыць ім галовы, лаяцца апошнімі словамі, але нельга. Даводзіцца смяяцца скрозь слёзы, скрозь гора. Шкада, што я не пісьменнік, я б напісала кнігу “За кулісамі фашызму”. Але яе напішуць без мяне, напішуць добра.

Дзядзя Сяргей, калі яшчэ патрэбна будзе якаянебудзь дапамога, прышліце каго-небудзь да мяне са словам “Овад”.

Мне не шкада жыцця, толькі я не хачу памерці падурному, а, галоўнае, так мала зрабіўшы. Калі я прынясу шмат карысці, больш у некалькі разоў, чым за-



Рэпазіторый БНТУ



*А.Б.Болдзісава*

раз, сваёй Радзіме, тады я скажу: цяпер я змагу спакойна памерці, свой абавязак перад табой, Радзіма, я выканала.

Овад».

Круглянскія маладагвардзейцы былі патрыётамі сваёй Радзімы ў высокім сэнсе слова. Уражвае прафесіяналізм, які супрацьпаставілі гестапа юнакі і дзяўчаты. Яны не мелі ніякай спецыяльнай падрыхтоўкі, аднак амаль два гады выйгравалі гэты смяротны паядынак. Але здзіўляе і юнацкая бестурботнасць, пагарджанне небяспекаю, правіламі канспірацыі, хоць пра гэта іх папярэджвала партызанскае камандаванне. Тое ж самае пісьмо партызанскаму камандзіру Жэня Цітова пісала на сваім працоўным месцы ў камендатуры, у самым асяроддзі ворагаў. Пра гэта сведчыць прыпіска да тэкста: «Дзядзя Сяргей, заканчваю, едзе самы галоўны наш бегемот (начальнік камендатуры. — **Дз.Х.**). Пішу на працы, толькі вельмі спяшаюся. Зараз ужо ўварвецца ў бюро і зараве на ўсю сваю глотку». Альбо іншы факт. Хоць члены "Обзора" і стварылі канспіратыўную структуру "пяцёрак", але на справе не вельмі яе прытрымліваліся. Круглае — невялікі населены пункт, усе адзін аднаго ведалі, і падпольшчыкі часта мелі зносіны паміж сабою, выходзячы за рамкі "пяцёрак". Па райцэнтры пайшлі чуткі аб падполлі.

Немцы таксама не маглі не звярнуць увагі на з'яўленне лістовак, скрытыя ці адкрытыя выпадкі супраціўлення, на ўцечку сакрэтнай інфармацыі. Пачаліся арышты. Пад падазрэнне трапілі перш за ўсё тыя падпольшчыкі, якія працавалі ў органах акупацыйнай улады. Шмат каго паспелі папярэдзіць Леанід Ракушаў, Клара і Жэня Цітовы, і частка падпольшчыкаў паспела ўцячы ў лес, да партызанаў. Але хутка самі сёстры Цітовы, а таксама Мікалай Ракушаў, Пётр Ракушаў былі арыштаваны. Не атрымаўшы прамых доказаў іх дачынення да падполля, фашысты накіравалі іх у Германію, у канцлагеры.

Трагічна склаўся лёс іншых членаў арганізацыі. У снежні 1943 г. падпольшчыкі дапусцілі грубейшую памылку ў канспірацыі: разам з разведданымі яны адправілі ў штаб брыгады спіс актыву "Обзора". Сувязны Міхаіл Шведаў трапіў у засаду каля в. Шаўкавінне і быў забіты. Спісы трапілі ў гестапа. Пачаліся павальныя арышты і расстрэлы. Загінулі Сяргей Казлоў, Леанід Ракушаў, бацька Мікалая Ракушава — Марк Акімавіч і брат Пётр, маці Клары і Жэні Цітовых Аляксандра Пятроўна, Сяргей Сухоцкі, муж і жонка Цімафей і Лізавета Крывялёвы, Іван Рылькоў, Аляксандр Дарашкоў, Фёдар Комлеў, А.М.Зіньковіч, Надзея Лазарчук, Ніна Болдысева, Васіль Гуркоў.

Як затым расказвалі відавочцы, Лізавета Крывялёва паспела крыкнуць перад расстрэлам: "Усіх не перастраляеце! Усё роўна вам, гадам, хутка прыйдзе пагібель". Частка падпольшчыкаў трапіла ў канцлагеры і такім чынам засталася ў жывых. Вось што пазней успамінала жонка А.Дарашкова Наталля: "У снежні 1943 года мой муж прыбег да хаты ўсхваляваны і сказаў, каб я тэрмінова знішчыла літаратуру (лістоўкі, падпольныя газеты) і схавала як мага далей пісталет і гранаты. Затым ён дадаў, што, па дакладных звестках, арыштаваны Ракушаў Леанід і што ён пойдзе даведацца што-небудзь канкрэтна. Аднак ужо на вуліцы ён быў арыштаваны. Неўзабаве гестапаўцы прыйшлі і ў наш дом, зрабілі вобыск, забралі рэчы, мяне з двухгадовай дачкой і павезлі ў турму... Муж мне змог перадаць у камеру запіску: "Пра тое, што я буду ў жывых, наіўна думаць, беражы сябе і нашу дачку. Можа, я быў калі-небудзь вінаваты, даруй мне. Бывайце, дарагія". Ноччу іх вывезлі з турмы, калі іх распраналі, я пачула голас мужа і страціла прытомнасць... Мяне ж пазней перапраравілі ў лагер у Талачын, але ў час пагрузкі ў эшалон для адпраўкі ў Германію я ўцякла".

Арыштаваныя не выдалі сваіх таварышаў, інакш ніхто з арганізацыі "Обзор" не выжыў бы.

Усе падпольшчыкі заслугоўваюць добрай памяці і пашаны. Але, на жаль, толькі Леанід Ракушаў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Больш таго, пасля вайны супраць падпольшчыкаў, якія працавалі ў нямецкіх органах улады, — Пятра Ракушава, Клары і Жэні Цітовых, пачаліся рэпрэсіі. Добра, што хутка разабраліся і знялі абвінавачванні. Мы ж не павінны страціць памяць пра падпольную патрыятычную арганізацыю "Обзор".

Рэпазіторый БНТУ